Тры разы фемінізм, жыццёвы шлях, супрацiў

У сваёй хвалебнай прамове Віёла фон Крамон-Таўбадэль ушаноўвае розныя жыццёвыя шляхі лаўрэатак прэміі і тое, што іх аб'ядноўвае: іхная актыўнасць, іхныя перакананні і іхная адданасць правам жанчын у Беларусі.

Дарагая Дар'я, дарагая Ірына, дарагая Юля,

Дарагая Імэ,

Шаноўныя госці Фонду імя Генрыха Бёля!

Сёння тут, у Берліне, ушаноўваюць трох жанчын. Перш чым сказаць некалькі слоў пра сітуацыю ў Беларусі – у вашай роднай краіне - хачу выказаць вам самыя цёплыя віншаванні. Вы заслугоўваеце гэтай узнагароды за вашу АСАБІСТУЮ актыўнасць - і для мяне вялікі гонар мець магчымасць выступіць тут з хвалебнай прамовай.

Гэтая цырымонія ўзнагароджання, безумоўна, добрая магчымасць зірнуць на сітуацыю ў Беларусі. Краіна, якая засталася ў пэўным цені варварскай захопніцкай вайны Расіі супраць Украіны.
Улічваючы драматычныя змены ў глабальнай палітычнай сітуацыі - абуральную карэкціроўку палітыкі Дональда Трампа ў дачыненні да Расіі - мы павінны глядзець з вялікай трывогай не толькі на Украіну. Нам таксама трэба больш пільна займацца суседнімі з Расіяй краінамі.

Мне ўдалося сабраць асабістыя ўражанні аб вашай краіне. Гэта было адносна даўно, але я тады была здзіўленая, што краіна аказалася зусім іншай, чым я чакала. Яна была вельмі еўрапейскай, цывілізаванай, прагрэсіўнай і феміністкай. І гэта пры тым, што Аляксандар Лукашэнка ўжо доўгі час кіруе краінай як дыктатар. Гэта досвед. З ходам часу дыктатары не развіваюцца пазітыўна. Наадварот. Яны становяцца больш рэпрэсіўнымі, больш жорсткімі і, у горшым выпадку, нават распальваюць вайну. Адзін з нешматлікіх пазітыўных бакоў цяперашняй сітуацыі - гэта тое, што пакуль Беларусі ў значнай ступені ўдаецца не ўдзельнічаць у вайне супраць Украіны.

Для большасці жыхароў Германіі Беларусь была невядомай тэрыторыяй.
Усё раптоўна змянілася з пратэстамі супраць фальсіфікацыі прэзідэнцкіх выбараў 2020 года. Тут мы ўбачылі, наколькі жорстка быў падаўлены дэмакратычны рух. І як Пуцін падтрымаў падаўленне пратэстаў.

Кожны, хто глядзеў на пратэстны рух, рабіў адно адкрыццё.

Пратэсты ўзначалілі жанчыны! Менавіта жанчыны сталі травам гэтага руху. Яны былі сапраўднай антыподам дзіўным мача-паводзінам Лукашэнкі.

Кіраўніку, які сцвярджаў:

*«Наша канстытуцыя не для жанчын. А нашае грамадства не даспела да таго, каб галасаваць за жанчыну. Бо паводле нашай канстытуцыі прэзідэнт мае вялікую ўладу».*

Ці ў дачыненні да пасады прэзідэнта:

*«Глядзіце: гэта не жаночая пасада. Я катэгарычна супраць таго, каб нагружаць жанчыну гэтай працай, жанчына не можа быць дыктатарам». (На самай справе гэта многае кажа пра яго ўяўленне аб самім сабе)*

Жанчыны сталі тварам руху

У жнівеньскія дні пасля сфальсіфікаваных выбараў 2020 года менавіта жанчыны пратэставалі і мужна ішлі наперад, арганізоўвалі масавыя мітынгі цывілізавана і дысцыплінавана, адстойвалі свае правы – і больш за тое: яны ўсміхаліся і раздавалі ружы сілавікам у балаклавах за барыкадамі, выкрываючы тым самым абсурднасць і вычварэнства рэжыму.

Пачынаючы з жаночай лідарскай тройкі ў выбарчай кампаніі – Святланы Ціханоўскай, Марыі Калеснікавай і Веранікі Цапкала – здавалася, што краіна бярэ ўладу ў свае рукі і, перш за ўсё, што жанчыны ў грамадстве не даюць сябе запалохаць, нягледзячы на масавы гвалт, тысячы арыштаў, катаванні і згвалтаванні жанчын у турмах.

У свой час мы неаднаразова ўставалі на бок гэтых мужных жанчын у Еўрапарламенце, выказвалі сваю салідарнасць, запрашалі іх у парламент, змагаліся за зняволеных актывістак і жанчын, арганізоўвалі грошы і спонсарства для іх сваякоў, але ў рэшце рэшт мы вымушаныя прызнаць: нягледзячы на ўсю нашу актыўнасць, мы не знаходзімся там, дзе хацелася б, каб была Беларусь. У вольнай частцы Еўропы. Таксама мы не змаглі вызваліць большасць жанчын і актывістак ад іх пакут – ні ад ціску ў грамадскай сферы, ні ад кайданоў у сямейным асяроддзі.

Вось чаму тым больш важна, што, ушаноўваючы нашых трох лаўрэатак у гэты вечар, мы надаём тром асобам з шэрагаў гэтых мужных феміністак увагу, якой яны так моцна заслугоўваюць за гады, нават часткова дзесяцігоддзі, адданасці справе, за іх перакананні і за іх барацьбу за правы жанчын у сваёй краіне.

Таму мне хацелася б падрабязна пазнаёміць Вас з нашымі трыма лаўрэаткамі прэміі, якія вельмі розныя ў сваёй дзейнасці, але яны аб'яднаныя ў сваёй мэце зрабіць велізарны прагрэс у фемінізме і правах жанчын у Беларусі.

**<u>Ірына Альхоўка</u>**

Ірына – адна з заснавальніц жаночага руху ў незалежнай Беларусі. Яна вельмі рана зразумела, чаго хоча, і вырашыла, акрамя акадэмічнай кар'еры, таксама заняцца грамадска-палітычнай актыўнасцю і практычнай дапамогай жанчынам.

Біяграфія Ірыны цесна звязана з распадам Савецкага Саюза ў 90-я гады. Страхі і цяжкасці, з якімі сутыкаліся жанчыны ў постсавецкіх краінах, таксама з-за эканамічных крызісаў, гіперынфляцыі і страты мільёнаў працоўных месцаў, даўно сцерліся з памяці многіх людзей, але наўрад ці можна недаацэньваць, час якіх вялікіх нягод гэта быў для жанчын.

Дзеля барацьбы, у прыватнасці, з гандлем жанчынамі, але і з дысбалансам сіл у сям'і, у канцы 90-х яна далучылася да грамадскай арганізацыі «Ла Страда Беларусь». Гэтая арганізацыя прапанавала практычную дапамогу жанчынам, якія трапілі ў бяду з-за хатняга гвалту. Ужо праз кароткі час Ірына дамаглася таго, што ў беларускае крымінальнае заканадаўства ўпершыню ўключылі пункт супраць гандлю людзьмі. Першы сапраўдны поспех яе працы!

Пазней былі створаны тэлефоны даверу і прытулкі для ахвяраў гандлю людзьмі. У 2012 годзе яна са сваёй камандай нават змагла стварыць нацыянальную гарачую лінію для тых, хто пацярпеў ад хатняга гвалту, дзе яна змагла даць парады і канкрэтную дапамогу тысячам жанчын, якія пацярпелі ад гвалту.
Усё гэта раптоўна спынілася пасля масавага дзяржаўнага гвалту ў 2020/2021 гадах. Яе арганізацыю таксама закрылі. Працягваць працу было ўжо немагчыма і нават настолькі небяспечна, што з таго часу яна вымушана жыць у выгнанні.

Але кожны, хто глядзіць на працоўныя/жыццёвыя дасягненні Ірыны звонку, можа распазнаць тры асноўныя кірункі яе дзейнасці:

- Яе высокая ацэнка ўсіх жанчын і сёстраў усіх узростаў. Асабліва ў маладыя гады яна аддавала вялікую даніну сваім калегам-жанчынам за ўсё, чаго яны ўжо дасягнулі ў справе роўнасці і правоў жанчын у савецкія часы.
- Яе ніколі не задавальняла адна ідэя, адна канцэпцыя або адна акадэмічная праца за гендарную роўнасць і роўныя правы. Яна імкнулася адрозніваць у сваёй працы жанчын, якія перажылі гвалт, і жанчын, якія знаходзяцца ў бядзе.
- Праца ў НДА сапраўды эфектыўная толькі тады, калі яна прыводзіць да канкрэтных зменаў у заканадаўстве і паляпшэнняў для жанчын. Таму (нават у вельмі складаных палітычных умовах у Беларусі) яна ніколі не ўхілялася ад канструктыўнай працы з уладамі па далейшым развіцці правоў жанчын на карысць жанчын.
За гэта ўсё яна заслугоўвае вялікі дзякуй!

**<u>Юлія Міцкевіч</u>**

Юлія наскрозь і цалкам абаронца правоў жанчын, ёй заўсёды даводзілася змагацца за свае перакананні. Яе бацькі, яе маці не былі саюзнікамі ў яе справе. Наадварот. Калі Юля вырашыла паступаць на журналістыку, маці не была ўпэўненая, што гэта правільны выбар для яе дачкі. Але Юлія не дала збіць яе са свайго шляху – і разглядала гэтыя невялікія перашкоды на прафесійным шляху хутчэй як дадатковую матывацыю.

Прыехаўшы ў Мінск, яна як гетэрасэксуальная жанчына адчула сябе часткай гей-супольнасці. Яна лічыла, што ёй вельмі пашанцавала, што яе там прынялі: атмасфера ў суполцы была інклюзіўнай, яны не толькі заснавалі агульную арганізацыю, але і адстойвалі агульную справу – і праз гэты досвед Юлія наблізілася да ідэй фемінізму.

Дзякуючы магістарскай праграме Юлія атрымала ўяўленне аб гендарных даследаваннях – яна была адной з першых студэнтак гендарнай магістарскай праграмы Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта.

Наступны крок у жаночай палітыцы яна зрабіла пасля таго, як сутыкнулася з рэальнасцю мужчынскай журналістыкі, уладкаваўшыся на сваю першую працу ў інфармацыйнае агенцтва БелаПан. Менавіта яе спантанныя выказванні, яе настойлівасць у пытаннях гендару і ЛГБТК+, а таксама яе выразная пазіцыя дазволілі ёй добра развівацца ў гэтым мужчынскім асяроддзі, нягледзячы ні на што.

Яе выхад у палітыку, якой яна прысвяціла шмат часу на працягу многіх гадоў кіравання моладзевай арганізацыяй адной партыі ў Беларусі, быў, аднак, значна больш жорсткі і варожы да жанчын. Але яе барацьба за квоты і роўнасць прынесла плён. Яна змагла дамагчыся 40-працэнтнай квоты для жанчын на выбарах у Каардынацыйную раду, якая працуе ў выгнанні (орган, заснаваны Святланай Ціханоўскай у выпадку змены ўлады ў Беларусі ў якасці альтэрнатывы дзяржаўным структурам у Беларусі).

Паколькі я асабіста ведаю і цаню многіх чальцоў Каардынацыйнай рады, то магу выказаць ёй толькі вялікую павагу. Тут, вядома, спатрэбілася шмат пераканаўчай справы. Бо нават калі мы кажам пра ўдзельнікаў як пра «ліберальныя галовы» з Беларусі, гэта не азначае аўтаматычнага захаплення феміністкімі ідэаламі і гендарнай роўнасцю!
Тое, што Юлія заняла пасаду намесніка ў пераходным кабінеце так званага ўрада ў выгнанні, сведчыць таксама пра тое, што яна разумее, як фармаваць палітыку не толькі на заднім плане. Яна разумее, што калі яна не гатовая ўвайсці ў палітыку і ўзяць на сябе адказнасць, іншыя не будуць змагацца за яе тэмы і яе перакананні. Яна павінна зрабіць гэта **сама**! У гэтым я пазнаю адданых палітыкаў

Тое, што яна сапраўды перакананая ў тым, што яна робіць, і ў сваёй працы, становіцца відавочным, калі яе пытаюць, ці лічыць яна, што заслугоўвае Жаночай прэміі імя Ганны

Кляйн. Яе просты адказ не толькі «так», але больш таго: «Я буду працягваць спрачацца і змагацца за жанчын, фемінізм і наш рух, нават калі мне будзе 90 (то бок «заўсёды») і надалей».
Для яе фемінізм, правы жанчын, роўнасць, але таксама і шчасце - гэта не проста нейкі перыяд яе жыцця, але гэта і ЁСЦЬ яе жыццё - і так, таму гэта больш чым дарэчна, што яна сёння адна з нашых ганаровых лаўрэатак!

**<u>Дар'я Афанасьева</u>**

Дар'у, якую сяброўкі і сябры называюць Дафнай, насамрэч мае два жыцці: адно да зняволення і другое пасля вызвалення. Два з паловай гады зняволення цалкам вырвалі яе з ранейшага жыцця. Усё ўжо не так, як было раней.

Прычына яе асуджэння ў 2020 годзе настолькі ж простая, наколькі сумная: яна здзейсніла крымінальнае злачынства праз феміністычную актыўнасць, праз розныя «эпізоды», фатаграфаванне плакатаў, падабайкі пад каментарамі ці проста апынуўшыся не ў тым месцы і не ў той час, праз што і падпала пад адзін з надуманых артыкулаў «экстрэмізму» лукашэнкаўскага рэжыму.

Наколькі няўпэўненай і баязлівай павінна быць дзяржава, калі яна праследуе маладых жанчын - такіх як Дафна - таму што яны звяртаюць увагу жанчын на іх правы, таму што яны курыруюць жаночую літаратуру, таму што яны вучаць іншых жанчын гісторыі фемінізму, таму што яны пішуць блогі і таму што яны ёсць часткай феміністскага руху. Той, хто забірае жыццё і дух гэтых маладых жанчын, такіх як Дафна, хто спрабуе зламаць іх, забараняючы і санкцыянуючы ў турме ўсё, што вызначала іх папярэдняе жыццё, не ўвасабляе моцную дзяржаву, а вельмі слабую.

Дафна была менавіта такой, якой мы сабе жадалі: актыўным членам грамадзянскай супольнасці, маладой, прагрэсіўнай, феміністкай і натхнёнай ідэяй перадаць як мага больш сваіх ведаў, духу і сілы іншым жанчынам і сёстрам.

Перш за ўсё гэту сілу забралі ў яе катаванні ў калоніі. Тут патрэбна менш эмпатыі і любові, чым цвёрдасці і трываласці. Жанчын пазбаўлялі і працягваюць пазбаўляць іх годнасці; каханне і сяброўства недапушчальныя.
У той жа час яна ўсё яшчэ падтрымлівае кантакты з многімі іншымі зняволенымі, з якімі яна падзяляла гэты час, які моцна паўплываў на іх. Асабліва з тымі, хто пасля шматгадовага трывання хатняга гвалту звяртаецца да радыкальных метадаў і ў бядзе не ведае, чым дапамагчы сабе, акрамя як абараніцца. Але ў турму ў Беларусі трапляе не гвалтоўны партнёр, а жанчына, якая толькі ўжыла самаабарону. Яна неаднаразова сутыкалася з гэтай абуральнай, зняважлівай да жанчын несправядлівасцю ў турмах і лагерах.

Пасля ўсіх цяжкасцей Дафна выйшла на волю праз два з паловай гады. Яна спадзявалася на жыццё на свабодзе, дзе яна зноў магла б жыць, кахаць, працаваць і весці блог. Але потым усё атрымалася зусім інакш. Свабода не прыйшла аўтаматычна пасля вызвалення. Дафна пакутуе ад посттраўматычнага стрэсавага разладу; яна ўсё яшчэ адчувае сябе знясіленай пасля зняволення, дзе не было ні цяпла, ні падтрымкі, ні тым больш разумення да яе лесбіянства. Нават праз дзесяць месяцаў ёй усё яшчэ патрэбна эмацыйнае аднаўленне.

Тое, чаго яна не страціла і што ніхто не мог адабраць у яе, нягледзячы на ўсе здзекі, - гэта яе гумар. І ў беларускім ГУЛАГу, і пасля вызвалення яна ўмела рассмяшыць вязынак сваім вельмі асаблівым гумарам (феміністычны стэнд-ап).

Змены, якія прынесла турма, застаюцца. Энергія Дафны зніжаная, акумулятар не так лёгка зарадзіць, жыццё з мінулага (з клубамі і вечарынамі) павінна пачакаць. Але я ўпэўненая, што такая цудоўная жанчына ў палітыцы сваёй воляй і вопытам здолее натхніць і ўзбагаціць

феміністкі рух, жанчын, квір-людзей і іншых членаў супольнасці. Зычу ёй гэтага ад усёй душы!

Спадзяюся, што я дала Вам усім невялікае ўяўленне аб розных жыццёвых шляхах нашых трох выдатных лаўрэатак.
Для мяне было гонарам пазнаёміцца з імі і зычу ўсім сэрцам, каб узнагарода дапамагла ім у іх працы і ў барацьбе за правы жанчын у Беларусі.